**Наталля Сацута**

# РАМОНКАВЫ ПАХ

## ВЕРШЫ

**Кобрын**
**2018**

ББК 84(Беи=Рус)-5

Рам 21

Сацута, Н.

Рамонкавы пах : вершы / ДУК "Кобрынская раённая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма", аддзел бібліятэчнага маркетынгу ; склад. А. М. Міхейкіна-Белякова. – Кобрын, 2018. – 52 с.

## Паважаны чытач!

Ты трымаеш у руках другі паэтычны зборнік Натальі Сацуты, у які увайшлі вершы аб жыцці, каханні, аб прыгажосці “любага краю, найлепшага ў свеце”, аб роднай вёсачцы, гумарэскі, дзіцячыя вершы. Яны адрозніваюцца глыбінёй пачуццяў, цікавымі вобразамі і прыгожай мовай.

Кніга разлічана на шырокае кола чытачоў.

Кіраўнік народнага
літаратурнага аб’яднання
“Белый аист”
Людміла Іванаўна
Лазюк

# Сацута (Нікалайчук) Наталля Мікалаеўна

Нарадзілася 19 кастрычніка 1976г. у вёсцы Гутава Драгічынскага раёна Брэсцкай вобласці. Сваёй малой Радзімай лічу вёску Хабовічы Кобрынскага раёна, дзе прайшло дзяцінства і школа. У 1995 г. скончыла Пінскае педагагічнае вучылішча, а ў 2000 г. Брэсцкі дзяржаўны педагагічны універсіт імя А.С. Пушкіна па спецыяльнасці "Настаўнік пачатковых класаў". Амаль пяць гадоў працавала настаўнікам пачатковых класаў, потым выхавальнікам дзіцячага яслі-сада № 13 г.Кобрына. Са снежня 2003 года і па сёняшні дзень - кіраўнік фізічнага выхавання ў гэтай жа дашкольнай установе.

Друкавалася ў раённай газеце "Кобрынскі веснік", калектыўных зборніках "Свет великой победы", "Под крылом белого аиста", "Зямля бацькоў дае натхненне", альманахах "Жырандоля", "Справа", "Культурнае жыццё Брэстчыны", часопісе "Топ сканворд". З'яўляюся дыпламантам фестываля бардаўскай песні і паэзіі "Сонечны". Выпусціла невялікі аматарскі зборнік вершаў "Подари мне небо в звёздах".



## Лёс дзяўчыны

Снегам белым занясло,
Замяло дарогі.
Ледзь дзяўчына па іх йшла,
Ледзь трывалі ногі.
Сілы скончыліся ўжо,
І праз дзве хвіліны
Спынілася адпачыць,
Ля старой яліны.
Так асела назаўжды,
Сном заснула вечным.
Толькі сумныя вятры
Абдувалі плечы.
З цягам часу занясло
Гэтую карціну.
Але памятае лес
Сумную дзяўчыну.
З надыходам халадоў
Зноў ён адчувае
Той дзявочы ціхі стон:
– Усё, я паміраю...
Так балюча зашуміць,
Быццам сэрца мае.
І магілу ўвесь час
Ён аберагае.
- Спі спакойна, вечна спі
Ды даруй старому,
Што не змог я зберагчы -
Не дайшла дадому. *1992*

## Спатканне

Летні дожджык крапаціць.
Вымакла сукенка.
Не ідзе, а ўжо бяжыць
Дзяўчынка Аленка.
Пакуль бегла, пакуль йшла,
Звонкія дажджынкі
Падганялі ўсё хутчэй,
Бо няма часінкі.
Прыйдзе ён ці не прыйдзе? -
Сэрца трапятала.
Так, ідучы па вадзе,
Яна разважала.
Вось ужо мінуе лес,
Задрыжалі ногі.
Скончыўся ліствы навес,
Выйшла да дарогі.
Раптам бачыць ля дубка
Любага хлапчыну,
Кветкі ў яго руках
Для сваёй дзяўчыны.
Як пабачыў – пасвятлеў,
Выйшаў на сустрэчу.
Галасоў пранёсся спеў,
Як у першы вечар.
І забылі пра ўсіх
Ды пра ўсё на свеце.
Бо каханне грэе іх -
Двум ім шчасце свеціць. *1992*

## Сама я ў тым вінавата

Сустрэчы ўжо не чакаю,
Надзеяй не пешчу сябе.
Ды толькі ўсё роўна кахаю
Адзіны мой, толькі цябе.
Сама я ў тым вінавата,
Што мы разышліся з табой.
Што згінула нашае шчасце,
Змянілася горкай тугой.
Напоўнена сэрца адчаем,
Журботную песню пяе.
І ўсё, што было незвычайным,
Прыпомніцца толькі ў сне.
Сама я ў тым вінавата,
Што нас раздзялілі шляхі.
Самотнасць за ўсё мне расплата,
Ты ж, любы, шчаслíва жыві!

*1994*

*******

Вярба цвіце штогод пяшчотна,
Нясе красу адвечную вясне.
Мой любы край! Ты бессмяротны!
Найлепшы ў сусвеце для мяне.
Тваіх лугоў квяцістыя ўборы,
Шумлівы гоман спелай збажыны,
Твае лясы, блакітныя азёры
Чаруюць зноў ад лета да вясны.

*12 лістапада 2010*

## На досвітку

Ціха на досвітку з ложка ўстану,
Выйду ў сарочцы на двор басанож.
Свежасцю пахне і сенам духмяным,
Цёплая вільгаць наўкол да таго ж!
Ногі казыча трава маладая,
Не зварухнецца ніводны лісток.
Вёсачка дрэмле мая дарагая,
У стоенай радасці сцішваю крок.
Певень спяваць завядзецца заўзята,
Ураз адзавецца карова ў хляве.
Новая раніца зноў распачата,
Песняй маленства над хатай плыве.

*22 жніўня 2013*

## Прыгажосць

Прыгажосць.
Неаб’сяжных палеткаў прастор,
Вока песціць травы аксаміт
Шчэбет птушак ляціць аж да зор,
І бясконцы празрысты блакіт.
Цішыня.
Не дрыжыць аніводны лісток
Сонца яркім праменнем іскрыць,
Ды паветра гаючы глыток
Дзе сцяжынка ля рэчкі бяжыць
Маладосць.
Непаўторныя пахі вясны
Абудзілі навокал жыццё,

Навяваюць чароўныя сны
Ды кахання нясуць пачуццё.
Дабрыня.
Вабіць сэрца натхнённы матыў
Мяккім дотыкам свежай раллі,
Лёгкім подыхам будучых ніў,
Кожным крокам па роднай зямлі.

*23 мая 2011*

## Ветрык

Дзве прыгожыя бярозкі
Распусцілі валасы.
Ветрык ім заблытаў косы
Ды смяецца ад душы.
Раззлаваліся сяброўкі,
Сталі вецер дакараць:
- Ты, канешне, вельмі лоўкі,
Ды не трэба жартаваць.
Елкі вунь стаяць на ўзлеску,
Завітай да іх хутчэй.
Нарабі там шуму, трэску,
Уцякай з нашых вачэй.
Ветрык толькі ўсміхнуўся:
- Бараніў ад спёкі вас.
Бо ў бярозак закахаўся
Жартаўнік  ў першы раз.

*21 мая 2011*

## Па-над роднаю старонкай

Па-над роднаю старонкай
Наша песня льецца.
Смех, вясёлая гамонка
Навакол нясецца.
Усіх сардэчна бачыць рады
І гасцей шануем
Гэй, заходзьце ў нашу хату -
Смачна пачастуем.
Хай лагодным сонца будзе,
Поле з ураджаем,
Дабрабыту добрым людзям
Ад душы жадаем.
Хай заўжды гармонік грае
І пяецца песня,
Шчасцем сэрца напаўняе
Роднае Палессе .

*14 ліпеня 2014*

## Дачушка

Пагляджу на здымак -
Ты зусім малая,
Да стала яшчэ не дарасла.
Чыстымі вачыма
Свет ты аглядаеш,
Колькі ў іх радасці, цяпла!
Першая ўсмешка
На прыгожым твары,
Крокі асцярожныя твае...

Здзейсніліся хутка
Ўжо маленства мары –
Зараз перагоніш і мяне.
Час ляціць нябачна
Срэбракрылай птушкай.
Кожную хвіліну берагу.
Лёсу я ўдзячна
За цябе, дачушка,
Многае табе зрабіць магу.
Тваіх пацалункаў
Мне заўсёды мала,
Прыгарну да сэрца цябе я.
Лепшым падарункам
У жыцці мне стала
Любая дачушачка мая!

*25 лістапада 2011*

## Восень

Зашамацела лісце пад нагамі,
Як водгук восеньскай красы.
Сівы туман ахутаў дыванамі
Лугі, палеткі і  лясы.
Павольна цягнуцца па небе хмары,
Нахмурацца, сыпнуць дажджом.
І заміраюць да вясны ўсе мары,
Як заварожаныя сном.

*2012*

*******

Мне цалавала шчокі сонца,
Пяшчотай вецер атуліў,
Празрыстай чысцінёй бясконцай
Нябёсы надавалі сіл.
Не боязна цяпер упасці
На мяккі дол чароўных сноў,
Бо з новым разуменнем шчасця
Надзея заквітнела зноў.

*15 чэрвеня 2014*

## Рамонак

Дзіўны рамонкавы пах,
Сціпленькі, злёгку гаркавы.
Згубіцца недзе ў лугах,
Так і не зведаўшы славы.
Кветачка ў неба глядзіць,
Вейкі-пялёсткі ўзмахам,
Быццам вось-вось і ўзляціць
Лёгкім, гарэзлівым птахам.
Душу рамонак кране,
У жоўтае вочка загляну –
Ты не пужайся мяне,
Бо варажыць я не стану!

*1 кастрычніка 2013*

## **Рэчка і ручаёк**

Мякка высцілаўся
Туманочак сівы,
У рэчку закахаўся
Ручаёк гуллівы.
- Як жа ты мне люба, -
Ёй штодня журкоча.
- Ох, для сэрца згуба
Хараство дзявоча.
Слухала рачулка,
Супыніўшы хвалю.
Рэха несла гулка:
- Я цябе кахаю
Ціхай, цёплай плынню
У адказ шаптала,
Радасна дзяўчыне,
Бо сама кахала.

*23 красавіка 2013*



***

- Прываражыла ты мяне, прываражыла, -
Так горача на вуха мне шаптаў.
- Адкуль, прызнайся, у цябе такая сіла,
Што думаць я аб іншых перастаў.
- Не ведаю, што адказаць табе, каханы,
Бо і сама я ў чароўным сне.
Калі ты мною сапраўды зачараваны,
То робіш найшчаслівейшай мяне.

*3 верасня 2013*

## Па слядах вайны

Па слядах той жахлівай вайны
Маці пошук магілы вяла.
Час ляцеў ад вясны да вясны,
А яна ўсё надзеяй жыла.
Дасылала ўсюду лісты,
Нецярпліва чакала адказ.
Дзе, сыночак адзіны мой, ты,
Нібы ясная зорачка, згас?..
Адшукала старэнькай зусім
Помнік той са слязьмі абняла,
Гаманіла, як быццам з жывым,
Пакуль ноч на зямлю не сышла.
-Спі, сынок, даражэнькі ты мой.
Дачакацца сустрэчы змагла
І нарэшце адчула пакой
На ўскрайку чужога сяла.

*10 сакавіка 2015*

## Адзінота

Як мне абрыдла беззаганнай быць для ўсіх,
Калі няма аб кім штодзённа клапаціцца.
Наведваць па-магчымасці сяброў сваіх,
Каб да чужога шчасця толькі прытуліцца.
Не злоўжываючы гасціннасцю чужой,
Пайсці дадому са сваёю адзінотай,
І зноў сустрэне хата звыклай цішынёй,
Якую парушаць, здаецца, не ахвота.
І зняўшы маску задаволенай жыццём,
Што колькі часу ўжо насіцца старанна,
Хаця б на крышку супакоіцца віном
І ўявіць сябе адзінай і жаданай.

*6 лістапада 2012*



## Пад нагамі не чую зямлі

Пад нагамі не чую зямлі.
Як так сталася – не разумею.
І калі, загубіла, калі
Сваю веру, каханне, надзею.
На якіх мне сцяжынках шукаць
Тую радасць, што сонейкам ззяла.
Якім рэхам цяпер мне гукаць,
Каб шчасліваю доля зноў стала.
Шэрай птушкай з падбітым крылом
Узляцець не магу ў нябёсы.
Апаліла няшчадным агнём,
Пабялелі ад роспачы косы.
Не знайсці мне патрэбных тых слоў,
Каб табе адказаць, як жа будзе.
Не вярнецца каханне дамоў,
Бо цяпер мы чужыя ўжо людзі.

*13 верасня 2011*

## Так цяжка

Так цяжка па зямлі бывае крочыць,
Як ногі не ідуць, быццам скаваны.
Здаецца, што нячысты пільна сочыць,
Каб хутка не загойваліся раны.
На твар не нацягнуць ніяк усмешку,
У скрусе думкі душу разрываюць.
Як абысці той шлях ці тую сцежку,
Што не наперад, а назад вяртаюць.

Анёл за спінаю мой ціха шэпча:

- Цябе, заўсёды, вер мне, падтрымаю

Пакуль надзея напаўняе сэрца,
Ты не здавайся ў палон адчаю.
Вось цягнецца да сонейка былінка,
Якую вецер гне, ды не зламае…
Жыццёвыя нягоды – павуцінка,
Што восенню ў неба ўзлятае.

*17 жніўня 2013*

## **У лесе**

Праз верхавіны дрэў
Ледзь сонейка праб’ецца,
Птушыны рэдкі спеў
У лесе раздаецца.
Дурманіць галаву
Смаловы водар хвоі;
Прысяду на траву -
Хай сэрца маё гоіць.
Чарніцы з-пад кустоў
Выглядваюць пужліва,
“Што не ідзеш дамоў?”-
Пытаюцца маўкліва.
Калені абдыму,
Мне б толькі сіл набрацца;
Не адкажу чаму
Не хочацца вяртацца.

*5 верасня 2011*

***

Адгукнуцца ў сэрцы болем
Успаміны, што чорныя цені,
Супыню я сябе, даволі!
Лепей будучым жыць імгненнем.
Падвяду пад бядою рыску,
Пачынаю адлік спачатку.
Шчасце, ведаю, блізка, блізка,
Не міне гэтым разам хатку.
Навяду парадак у думках,
З смеццем вымяту ўсе нягоды,
Прыгатую яму ласункаў,
Каб яно засталось назаўсёды!

*15 верасня 2012*

***

Лісце жухлае золатам сцелецца
Не на шчасце маё, на бяду.
А мне ўсё аніяк не паверыцца,
Што каханага зноў не знайду.
І жыццё быццам не бессэнсоўнае,
Падтрымае заўсёды сям'я,
Без кахання чамусьці няпоўнае,
Узляцець не пускае зямля.
На сустрэчы, што ж , восень, ты сквапная,
Ў задуменні на неба гляджу,
Ці  то я ўжо зусім непрывабная,
Ці сцяжынкай не той я хаджу.

*14 верасня 2012*

***

Удваіх нам з табою цесна,
Немагчыма спакойна дыхаць.
Крыж кахання так доўга несла,
Што маўчанне ўжо не выхад.
Папялішчам мне не сагрэцца,
Размаўляць ўжо бессэнсоўна.
Так балюча зашчыміць сэрца
А табе? А табе ўсё роўна.

*17 лютага 2015*

***

Звыкла восень крочыць па ўзгорках,
Сыпле лісце пухкае наўкол.
І пусцее з кожным падвячоркам
Ад журбы асірацелы дол.

*22 кастрычніка 2017*



***

Зноў восень павуціння напляце,
Дажджу насыпле ў мяккую лістоту,
І ў птушынай дружнай грамадзе
Пасее развітальную самоту.

*21 кастрычніка 2017*

## Кукавала зязюля-гаротніца

Кукавала зязюля-гаротніца
На старой сасне аж да прыцемак.
Надакучыла быць бестурботніцай,
Ды змяніць усё, хто адкажа як?
Ой вы, дзеткі мае, птушанятачкі,
Нашто вас чужым я падкінула.
Ні гняздзечка няма, ані хатачкі,
Лепей зараз бы проста згінула.
Слухаў лес, спачуваннем напоўнены,
Ноч спускалася верхавінамі.
Зрэшты змоўкла зязюленька стомлена,
Толькі вецер выў між ялінамі.

*6 ліпеня 2015*



## Малінавыя пацалункі

Небасхіл ружавее па краі,
Цені мякка кладуцца наўкол.
Вось апошні праменьчык знікае -
Ціхі вечар ахутвае дол.
Ліхтары парасплюшчвалі вочы,
Напаўсілы спрасонку глядзяць.
А мы будзем з табой да паўночы
Ці да раніцы нават гуляць.
Салавейка шчабеча напеўна
Зразумелы каханню матыў.
Я хмялею - ад шчасця, напэўна,
І хмялееш, здаецца і ты.
Цеплынёй ахінаюць імгненні,
Пацалункаў малінавы смак.
Ну навошта ўстаў на калені?
Веру: люба табе я і так.

*21 лютага 2016*

*******

Дакраніся чуллівай душою
Да маёй трапяткой у цішы.
Чуеш, дыхаем разам з табою,
І так добра, так хочацца жыць.

*15 чэрвеня 2014*

***

Гэй вы, мары-летуценні,
Збеглі ад мяне куды?
Засталіся толькі цені,
Сэрца шчыміць ад нуды.
Скорчыў лёс сваю грымасу:
- Тваё месца на зямлі!
Крылы пыляцца да часу,
Мо спатрэбяцца калі.
Так сумую па блакіце,
Бо душа яшчэ пяе.
Да мяне хутчэй ляціце
Мары, ластаўкі мае.

*17 сакавіка 2016*

## Сцяжынка

Я сцяжынкай-стужкай крочу,
Выгінаецца яна.
Каля спелай нівы збочу:
Пахне хлебам збажына.
У нізінцы б`е крыніца -
Завітаю і туды.
Прагна хочацца напіцца
Найсмачнейшае вады.
А наперадзе бярэзнік
Харастоўм бярэ ў палон.
Ветрык гойсае, гарэзнік,
Травы хіліць ў паклон.
Вось рамонкі і валошкі

Заквітнелі ля мяжы.
Каля іх пабуду трошкі,
- Гэй, сцяжынка, зноў бяжы!
За табою паспяшаю
І спяваю на хаду.
Да самога небакраю
Можа, нават і дайду.

*22 лютага 2017*

***

Пусцеюць з цягам часу хаты,
Замест сцяжынак – мурава.
Вясёлым гоманам заўзятым
Не парушае ціш дзятва.
Тут дні ў працы патанулі
І божай літасцю – жыццё.
Напералік дзяды, бабулі,
Іх шлях кароткі ў забыццё.
Гляджу навокал і шкадую,
Прабач ты, вёсачка, мяне,
Што ў цесным горадзе жыву я,
А ці вярнуся? Можа й не… *13 мая 2017*



## Песня “Турыстычная”

Толькі вясна стане крочыць па краі,
Сонца заззяе ярчэй.
Сэрца вандроўнае так запалае:
Трэба ў дарогу хутчэй!
Змесцяцца ўсе неабходныя рэчы
Ў трохі пацёрты рукзак.
Скажам кватэры: “Бывай, да сустрэчы!
Нам без турзлёту ніяк!”
Прыпеў:
Гэй камары ды мошкі,
Вы пачакайце трошкі,
Пакуль гітара грае
І песні ля кастра.
Так вабіць нас прырода,
Турысцкія прыгоды,
Знаёмыя мясціны
Наведаць зноў пара.
Лес нас як родных ужо сустракае,
Ветліва дрэвы шумяць.
Колькі палатак, глядзі, вырастае,
Будзе з кім час каратаць.
Вяжам вузлы і знаходзім пікеты,
Хуткасць пакажам і спрыт.
Смачную ежу гатуем пры гэтым
І ўладкоўваем быт.
З першымі зоркамі разам збярэцца
Новае кола сяброў,
І заспяваем ад чыстага сэрца.

Песню вясёлую зноў.
Недзе чакаюць сцяжынкі-дарогі,
Што мы яшчэ не прайшлі.
Ды забываюцца смутак,  трывогі.
Толькі на роднай зямлі.

*12 мая 2017*

***

А ты скажы мне колькі
Яшчэ чакаць
І ў адчаі горкім
Слязу глытаць.
Скамечанай паперай
Душа трымціць,
І не хапае веры
Чаканнем жыць.
Патухнуць хутка зоркі
Ды ноч зыйдзе
Скажы: чакаць мне колькі
І дзе ты, дзе?

*1 снежня 2015*



## Інтэрнэт-крама

Кажуць, што ў інтэрнэце
Можна ўсё купіць на свеце
І каштуе там танней -
Захацелася і мне.
Вось і парасон харошы,
І зусім малыя грошы.
Пад дажджом прайшла пасля -
Мокне ён і мокну я!
Майку з зайцам заказала,
А з рагамі атрымала.
Падазрона муж глядзіць:
Як цяпер яе насіць?
Сонечныя акуляры
Мне не падышлі да твару.
А шкарпэткі я, дзяўчаткі,
Нацягнула ледзь на пяткі.
Ох, не ведала турботы,
Выпісала сабе боты.
А даслалі (аж не веру)
Сорак пятага памеру.
Блузу белую чакала,
Ды зялёная папала.
Можа, у гандляра няўрокам
Нешта дрэннае са зрокам?
Сумка лепшаю была -
Месяц вытрымаць змагла.
А пальчаткі – во ку-ку! -
Дзве на правую руку!

Ах ты, долечка-нядоля,
Не было бы гора болей.
Дзе танней усё шукала,
Марна грошы праматала.

*15 сакавіка 2016*

## Суседкі

Добрыя суседкі ранкам
Выйшлі на падворкі,
Вешалі бялізну
Ды вялі гаворку.
- Паглядзі, сукенка ззяе,
Чыстая ад прання.
- Згодна, - мовіла другая.
- Няма наракання.
- Ты ж яе зусім нядаўна
Выкупіла ў краме.
Мая ж белая таксама
А гадкоў бы маме.
- Ой, наўмысна так сказала:
Зайздрасць разбірае,
Бо твой зарабляе мала,
А мой грошы мае.
У цябе адзення шмат,
Бы у той капусты.
Ды, як кажа мой Ігнат
Яшчэ б трошкі густу.
Твой Ігнат сябе не бачыць,
Сам жыве без меры:

Есці любіць і лайдачыць,
Хутка выйме дзверы.
А вось мой Сцяпанка статны,
Як у маладосці.
Бацька і мужык выдатны,
Лепшы за кагосьці.
Ён такую постаць мае,
Бо ты корміш мала,
Пакуль плёткі пазбіраеш,
То ўжо й ноч настала.
Кажаш, гэта я пляткарка
Ой, глядзі ж, святая
У сяле якая сварка
Без цябе бывае?

Далей гвалт такі пачаўся,
Не на жарт, дарэчы,
Хто б пад руку ім папаўся,
Маглі б пакалечыць.
Бруду столькі накапалі
Без якой прычыны,
Што сяброўства разарвалі
Назаўжды жанчыны.

*20 студзеня 2014*



## Роспач

Званок апошні – наймілейшы,
Смяюцца дзеці ды спяваюць.
Малодшым добра, а старэйшых
Яшчэ экзамены чакаюць!
А цёплы чэрвень прыпякае –
Вучыць білеты немагчыма.
Падручнік кінуўшы, збягае
Хоць крышку пагуляць дзяўчына.
Змяніў дзянёк ласкавы вечар,
Бо непрыкметна час імчыцца.
Наступны дзень: сябры, сустрэчы,
Хіба магчыма тут вучыцца?
Як ноч апошняя настала,
Няма куды цяпер адкладваць.
Шпаргалкі да рання пісала,
Знайшла адзенне, каб іх складваць
Спакойна ў клас зайшла дзяўчына –
Білет любы, як ні загадвай.
Настаўнік жа зірнуў вачыма:
- На стол паперкі ўсе выкладвай!
Ахутаў роспач вучаніцу:
- Як здагадаліся адразу?
- Такую доўгую спадніцу
Не апранала ты ні разу!

*6 сакавіка 2013*

## Злодзей

Змяркаецца, у акенцах загараецца святло,
На скрыжаваннях цішыня, машын не мае.
Мясцовымі завулкамі ў калгаснае гумно
Крадзецца злодзей за дарэмным ураджаем.
Пад ногі кінуўся, загаўкаўшы, малы шчанюк.
Нагой штурхнуў яго: "Бяжы адсюль, блазнота."
Бо сэрца так трымціць, пужае кожны гук,
А выканаць патрэбна яшчэ чорную работу.
Мяшкі для зерня загадзя ён у траве схаваў,
Стары замок адбіць тут клопат невялікі,
А вартаўнік яшчэ зрання гарэлку смакаваў,
Спіць за гумном, яго ўжо зараз не даклікаць.
Ціхенька праслізнуў, агледзеўся наўкол спярша,
Дзе лепей зерне ўсё навобмацак шукае,
Трасуцца вельмі рукі, непакоіцца душа,
Аднак мяшкі да верху шпарка насыпае.
Тут неўзабаве вецер так дзвярыма шыбануў,
Жахнуўся злодзей ды на зерне паваліўся,
А вецер без замка надзейна дзверы так замкнуў,
На нейкі момант нават злодзей разгубіўся.
Ды апрытомеў хутка і акенца ўглядзеў
Адзін на аднаго мяшэчкі склаў ён роўна,
Палез пад дах, праціснуцца хацеў,
Ды ўпіхнуцца здолеў толькі да паловы.
На тое гора разляцеліся мяшкі пад ім:
Тут галава, на вуліцы ж тырчалі ногі.
Заенчыў так, што чутна было б і глухім
Вартаўніку ж са сну здаліся чорта рогі.

Так напужаўся, што надоўга мову адняло
З гарэлкай больш не сябраваў да скону веку
Са злодзея ж мо з год смяялася ўсё сяло
Вось дык няўдалы злодзей, словам, недарэка.

*10 кастрычніка 2012*

## Зарок

Расплюшчыў хлопец вочы зранку
І свайго твару не пазнаў:
Ці то ўсю ноч гуляў з каханкай,
Ці то з сябрамі – не згадаў.
Не мог на думкі траціць часу,
Гудзела надта ў галаве.
Піўка б бутэлечку ці квасу -
Здароўе выправіць сабе,
Вадою смагу прытупіўшы,
Нарэшце стаў ён разважаць.
З гарэлкай жарты не папішаш,
Сабе зарок павінен даць.
Не буду болей піць без меры.
Трымаюць слова мужыкі,
Як-то калісьці піянеры.
Губіць жыццё мне не з рукі.
Ад гэтай думкі пасвятлела
Рашуча хлопец дзень пачаў,
Работа ў руках гарэла…
Так вечарок яго застаў.
І, як бывае, пасля працы
Сябры зноў клічуць адпачыць,

З дзяўчатамі патусавацца
Ды  і па чарцы прыгубіць.
А за сяброў – заўжды гарою
Не, іх ніяк не падвяду.
Я ўжо валодаю сабою,
Крыху пабуду і пайду…
І зноў гулялі да паўночы,
Дадому ледзьве даблукаў.
Прыціхла хлопец сплюшчыў вочы,
На ложак, як стаяў, упаў.
Зноў ранкам галава балела,
Даваўся цяжка кожны крок,
Ад смагі горла аж кіпела –
І зноў  забыў пра свой зарок.

*21 мая 2011*

## Жаночае свята

Вочы раніцай адкрыла,
Ледзьве не ўскочыла.
"Як жа гэта я забыла -
Свята ўжо жаночае!"
Мужа локцем штурханула:
- Што ж не падымаешся?
Сама смачна пазяхнула:
- А я  паваляюся!
Ледь на кухню ён паплёўся,
Апусціўшы галаву.
Там бубнець ураз завёўся:
"Што за свята гэта, цьфу".

Ой, грымела і шкварчэла,
Быццам нешта майстраваў.
І яечню разам з салам
Ён, нарэшце, згатаваў.
“Толькі я без падарунка, –
Кажа любы. - Выбачай”.
Грошай даў ён з пацалункам:
“Лепш сама ідзі купляй”.
Трэба ж, так пашанцавала,
Я сабралася хутчэй.
А яго абавязала
Прыбіраць, глядзець дзяцей.
З асалодай пагуляла,
Усе крамы абышла.
А дадому паспяшала,
Калі грошы развяла.
Тэлевізар я глядзела,
Любы дзетак пайшоў мыць.
Паляжала, пасядзела.
Так заўжды б, дзяўчаты, жыць.
За дзянёк я адпачыла,
У ложак скокнула сама:
“Да мяне ідзі, мой мілы”.
Стогне: “Моцы ўжо няма”.
Ён заснуў, а я не кпіла,
Моўчкі ўсміхалася:
- Паглядзі, якая сіла,
Ды за дзень зламалася.

*3 сакавіка 2012*

## Полька «Пайшоў дзедка на бяседу»

Пайшоў дзедка на бяседу
Са сваёй бабуляй,
Каб з ёй сораму не зведаць,
Схапіў маладую!
Прыпеў:
Гэй, гэй, грай, музыка,
Польку на ўсе бокі,
Бо пусціўся стары дзед
З маладой у скокі.
Стан дзявочы так ласкава
Рука абнімала,
Закруціўся ў танцы жвава,
Лысіна заззяла!
Шпарка музыка іграе,
Дзеўчына смяецца,
Дзедка ледзьве паспявае,
Сэрца моцна б’ецца.
Стала дзеду не да смеху,
Узмакрэў ад поту,
Толькі людзям быць пацехай
Вельмі не ахвота.
Ледзьве польку даскакаў
Ды хутчэй на лаўку,
Больш дзяўчат не запрашаў
Толькі сваю бабку!

*26 лістапада 2012*

## Песня “Вёсачка мая”

Певень гучна запяе
Раніцу гукае,
Вёсачка ўжо ўстае,
Працу пачынае.
Свінка рохкае ў хляве
І раве карова.
Па ваду сусед ідзе:
-Добры дзень! -Здарова!
Гэй ты, вёсачка мая,
Лепшай быць не можа.
Тут жыве ўся радня:
-Дзякуй табе, Божа!
Сядзем разам, запяем,
Чарку падымаем.
Добра мы, браткі, жывем,
Вам таго жадаем.
Ад зары і да зары
І вясной і летам,
Тут грукочыць трактары,
Ходзяць па палеткам.
А збярэмся ў вольны час
Рассказаць навіны,
Хто ўжо ажаніўся ў нас,
У каго радзіны.
Што ж ты, вёсачка мая,
Сціплая такая,
І без працы ані дня
Нават не бывае.

Выпаў добры ураджай,
Ёсць чым ганарыцца.
Вёсачка гасцей склікай,
Будзем весяліцца.

*21 кастрычніка 2018*

## Пераклад з украінскай мовы Д. Фалькоўскага “Голубіють ранки… Голубіють роси…”

Блакітнеюць ранкі… Блакітнеюць росы…
Блакітнее восень у садзе…
І хутка ля брамы ўжо іней раскосы
На жоўтае лісце асядзе.

І вецер самотны прайдзецца па сёлах
У песні журботнай, у плачы…
І стане, расцеле туман невясёлы
Над садам прыніклым уночы.

Калі ж прыйдзе ранак, пагляне ён скоса
На шэрасць і сумнасць прыроды –
Адно павуцінне  ды срэбранасць росаў
Успомніць вясну ўсім нагода.

*29 кастрычніка 2018*

## Разумная жонка

У хацiначцы драўлянай
Жыў Васiль са сваёй Ганнай.
Дзецi ўжо павырасталi,
Ды ў горад паўцякалi.
Прыязджалi час ад часу
За кавалкам сала, мяса.
I бацькi дапамагалi –
Працавалi, гадавалi.
Клопату было даволi
З гаспадаркай ды ў полi.
I такi сялянскi побыт
Да журбы давёў асобу.
Знайшоў выйсце Васiль шпарка -
Стаў прыкладвацца да чаркi.
Ды разумная кабета
Справу вырашыла гэтак:
Да гарэлкi з усёй злосцi
Далiла яшчэ чагосьцi.
А пасля ўжо за абедам
Завяла гаворку с дзедам:
- Ледзь жывым ты мне прыснiўся,
Так гарэлкай атруцiўся!
- Ганна, ты ўжо старая,
I зусiм, бы пень, дурная!
Хiба ж чарка пакалечыць,
Не, як трэба, то палечыць.
Гаспадыня з бляскам вочак:
- Сцеражыся, галубочак.

А Васіль ўсё смяецца
Пуза, як гарбуз, трасецца.
Лязгатала б лепш ты меней!
І пайшоў сабе ў сені.
Там хутчэй глытнуў употай
Ды узяўся за работу.
Раптам скончылася сіла -
Так гаспадара скруціла.
Ледзьве ён дабег да плота,
Толькі ўстаў – і зноў ахвота.
З паўгадзіны ўпрысядку,
Потым - шусь у сваю хатку.
Каўтануў з гарла нядрэнна
- Родная, палеч сумленна!
Пяць хвілінак не прайшло,
Закруціла, запякло,
Ой, жывот бурліць, спявае,
Сіл трымацца больш не мае.
Усю ночку ў агародзе
Сядзеў, вохкаў у нягодзе.
Дарма Ганну не паслухаў -
Ледзь не выпусціў ён духу!
Так ахвоту піць адбіла,
Вось, як жонка навучыла!

*9 кастрычніка 2011*

## Гараджанка

На мясцовую гулянку
У далёкае сяло
Маладую гараджанку
Нейкім ветрам занясло.
Даўганогая студэнтка,
З ладным станам: “Ах, ах, ах!”
Наймаднейшая сукенка,
На абцасах – проста жах!
Хлопцы ўсе бы анямелі,
Як слупы радком стаяць.
Можа што й сказаць хацелі -
Толькі вочы зіхацяць.
Прыгажуня, шчэ й якая,
Кучаравы валасы,
Кіпцюры даўжэзны мае,
Ды з малюнкам для красы.
Праплыла як быццам, сцежкай
Азірнулася назад,
І з пагардлівай усмешкай
Паглядзела на дзяўчат.
А дзяўчат нават скрывіла:
- Што за цаца, божа ж мой!
Увесь сорам загубіла,
Не сябруе з галавой.
Тут зайграў музыка звонка,
Выйшла пава танцаваць.
Юнакі наперагонкі
Яе сталі запрашаць.

Усе пакорныя такія,
Ды ліслівыя яшчэ.
Быццам шчанюкі малыя,
Толькі сліна не цячэ.
Раззлаваліся дзяўчаты:
- Трэба хлопцаў нам вяртаць!
Распачалі тут заўзята
Недахопы ў ёй шукаць.
- Паглядзі, касыя вочы
І зусім гарбаты нос,
Як сустрэнеш сярод ночы,
Напужаешся да слёз.
Гараджанка ж весялілась,
Нос угору падняла;
Тут за дошку зачапілась -
Утрымацца не змагла.
Ды звалілася няўдала,
Адляцелі кіпцюры,
Шапка валасоў упала-
Вось табе і кучары.
А пад імі рыжы грэбень,
Дзеўцы ўжо не да пацех.
- Рыжы певень! Рыжы певень! -
Паляцеў навокал смех.
Несапраўдная, чужая
Прыгажосць яе была.
Ганарлівая такая
Посмех стала для сяла.

*10 верасня 2011*

## Раз вясеннім надвячоркам

Раз вясеннім надвячоркам
Сонца села, можа й не.
Не пра тое тут гаворка -
Прыйшоў хлопец да мяне.
Ён прынёс цукеркі, кветкі
І бутэлечку віна
Я на стол абрус, сурвэткі
Тое-сёе да стала.
Выпілі ды закусілі,
Размаўлялі аб усім
Зоркі за акном лічылі
І зайздросцілі мы ім.
Раптам ён прышчурыў вочы,
Ціхім шэптам выдае:
- Мне віно да позняй ночы
Многа сілы надае.
- Што, скажы на ўвазе маеш?
У душы маёй мяцеж:
- Зараз ты мяне пужаеш ці надзею падаеш.
Мылася ў ванне шчыра,
Скура ззяе і рыпіць,
Дзверы ў пакой адкрыла
А ён там ўжо храпіць.
Не, мяне цяпер не купіш
І скажу, дзяўчаты, вам
Пакажыце хлопцу кукіш
Калі просіць хоць сто грам! *16 мая 2013*

## Летняя ноч

Цёплая ноч за акном
Ходзіць ад хаты да хаты,
Хмарка вісіць над сялом,
Быццам мядзведзік калматы.
Так не хапае дажду,
Травы ад смагі самлелі,
У неба без зорак гляджу,
Хочацца, каб зіхацелі.
Вось пераззвон па страсе.
Лівень пачаўся, здаецца,
Росную свежасць нясе,
Прагна зямелька нап'ецца.
Жменямі дождж раскідаў,
Стала паветра празрыстым,
Месячык зрэшты заззяў
У небе высокім і чыстым.

*26 верасня 2013*



## Павуцінка

Срэбрам ззяе павуцінка,
Разам з ветрыкам ляціць.
Здзіўлена глядзіць дзяўчынка:
- Як такое можа быць?
- Мамачка, не разумею,
Павучок падзеўся дзе?
Як дагнаць ён не паспее,
Засумуе ў бядзе!
- Не губляй свайго спакою,
Павуцінка хай плыве,
Вераснёваю парою
Так заўжды яно жыве.
Павучок перазімуе,
А калі вясна прыйдзе,
Павуцічанку другую
Зноў сабе тады спляце.
Усміхнулася дзяўчынка:
- Павуціначка, бывай!
Сонейку ты ад Ірынкі
Прывітанне перадай!

*12 верасня 2013*



## Люты

Завіхаўся ранкам люты:
Снегам дахі пакрываў,
Дрэвы інеем ахутваў,
Лёд на рэчцы мацаваў.
Ды нарэшце ён стаміўся,
Цяжка люты ўздыхнуў.
Ля ялінкі прымасціўся –
Не заўважыў, як заснуў.
Доўга спаў ён і не ведаў,
Што зіма ўжо прайшла.
А вясна ідзе па следу,
Шмат нясе з сабой цяпла.
Стала горача ад сонца -
Абудзіўся люты ўраз.
Ручайкі звіняць бясконца,
А мароз даўно ўжо згас!
Ад снягоў адна каёмка,
Мокнуць боты, кажушок.
Стала лютаму няёмка,
І пусціўся наўцёк

*10 лютага 2012*

*******

Цётка Зося сваім дзеткам
Вяжа цёплыя шкарпэткі,
Рукавічкі, шапку, шалік,
Каб марозы не пужалі.

*1 снежня 2016*

***

Маці немаўлятка
Гушкала, люляла.
Спі, маё дзіцятка,
Бо пара настала.
Месячык за хмаркай,
Зорачкі паснулі,
Ночка ходзіць шпарка.
Люлі, люлі, люлі.

*1 снежня 2015*

***

Заклікае сняжынкі вецер
Да гарэзлівай мітусні.
Сонца проста на дзіва свеціць,
Вочы слепіць ад чысціні.
Ледзяшамі марозік грае,
Думак радасных карагод.
Да спадобы зіма такая,
А наперадзе – Новы год!

*13 снежня 2016*



## Страта

Адным прыгожым летнім ранкам
На вуліцы Алесь гуляў.
З машынкай, трактарам і танкам
Ён без сяброў не сумаваў.
Сваю кішэню зрэдку мацаў,
Бо там вялікі клад ляжаў -
Цукерак шмат паклала маці,
І хлопчык іх аберагаў.
Між тым  вясёлы ветрык дзьмухнуў,
Пабегаць хлопца запрасіў;
Алесь падняўся, нагой тупнуў,
Панёсся колькі было сіл.
Ад радасці і хвалявання
Ўсю асцярожнасць ён забыў:
Сваё салодкае сняданне
На сцежцы ці ў траве згубіў.
Праз нейкі час – мац у кішэню,
Ды там нічога не знайшоў...
Была цукерак ажно жменя!
Алесь ад роспачы зароў.
На тое шчасце гэтым шляхам
Жанчына добрая ішла.
Усё сабрала адным махам,
Ласункі хлопцу аддала.
Адразу твар кранула ўсмешка!
«Вялікі дзякуй!» - ён сказаў,
І зноў прывабнай стала сцежка,
Алесь шчаслівы заспяваў.

*13 ліпеня 2011*

## Казачка пра дожджык

Адпусціла мама-хмарка
Дожджык на зямлю гуляць.
- Ды не бегай вельмі шпарка,
Людзі будуць уцякаць!
Але маміну параду
Ён даслухаць не паспеў,
Бо не мог павольна падаць -
Так знайсці сяброў хацеў.
І пабег ўздоўж дарогі,
Вельмі дожджык паспяшаў,
Свае доўгенькія ногі
Хуценька перастаўляў.
Вунь - гульнёвая пляцоўка,
Вельмі многа тут дзяцей.
Так з пясочка лепяць лоўка;
Падышоў туды бліжэй.
Як сыпнуў на іх знянацку-
Усе пабеглі, хто куды.
Пакідалі свае цацкі,
Забаяліся вады!
Дожджык сумна азірнуўся
І сабе далей пайшоў.
Каля саду апынуўся,
Хлопчыка ён там знайшоў.
На яго зірнуў з усмешкай:
“Давай будзем сябраваць!”
А хлапчук падняўся спешна
Ды дадому ўцякаць.

Добры дожджык сеў на лаўку
І ад крыўды плакаць стаў.
Пацякла вада ў канаўку;
З ім ніхто не сябраваў.
І нарэшце здагадаўся,
Што дзяцей сам распужаў.
Дожджык сцішыўся, падняўся,
Слёзы ліць ён перастаў
Чуе, нехта так смяецца,
Галасочак аж звініць.
Можа ўжо яму здаецца,
Хто яшчэ тут можа быць?
І ўбачыў ён дзяўчынку,
Весялуху да таго ж.
У руцэ нясе хусцінку,
Шпарка крочыць басанож.
Ды па лужыцах гуляе,
Пырскі ў бакі ляцяць.
Кроплі на далонь збірае:
- Будзем, дожджык, сябраваць!
Развіталіся пад вечар,
- Што ж, сяброўачка, бывай!
- Да сустрэчы!
-Да сустрэчы!
- Хутка ў госці зноў чакай.

*20 студзеня 2012*

## Змест


Лёс дзяўчыны .......... 5
Спатканне .......... 6
Сама я ў тым вінавата .......... 7
Вярба цвіце штогод пяшчотна .......... 7
На досвітку .......... 8
Прыгажосць .......... 8
Ветрык .......... 9
Па-над роднаю старонкай .......... 10
Дачушка .......... 10
Восень .......... 11
Мне цалавала шчокі сонца .......... 12
Рамонак .......... 12
Рэчка і ручаёк .......... 13
Прываражыла ты мяне, прываражыла .......... 14
Па слядах той жахлівай вайны .......... 14
Адзінота .......... 15
Пад нагамі не чую зямлі .......... 16
Так цяжка .......... 16
У лесе .......... 17
Адгукнуцца ў сэрцы болем .......... 18
Лісце жухлае золатам сцелецца .......... 18
Удваіх нам с табою цесна .......... 19
Звыкла восень крочыць па ўзгорках .......... 19
Зноў восень павуціння напляце .......... 20
Кукавала зязюля-гаротніца .......... 20
Малінавыя пацалункі .......... 21
Дакраніся чуллівай душой .......... 20

Гэй вы мары-летуцені ........................................ 22
Сцяжынка ........................................ 22
Пусцеюць з цягам часу хаты ........................................ 23
Песня “Турыстычная” ........................................ 24
А ты скажы мне колькі........................................25
Інтэрнэт-крама ........................................ 26
Суседкі ........................................ 27
Роспач ........................................ 29
Злодзей ........................................ 30
Зарок ........................................ 31
Жаночае свята ........................................ 32
Полька “Пайшоў дзедка на бяседу” ........................................ 34
Песня “Вёсачка мая ........................................ 35
Блакітнеюць ранкі ........................................ 36
Разумная жонка ........................................ 37
Гараджанка ........................................ 39
Раз вясеннім падвячоркам ........................................ 41
Летняя ноч ........................................ 42
Павуцінка ........................................ 43
Люты ........................................ 44
Цётка Зося сваім дзеткам........................................44
Маці немаўлятка гушкала, люляла ........................................ 45
Заклікае сняжынкі вецер ........................................ 45
Страта ........................................ 46
Казачка пра дождж ык ........................................ 47

Літаратурна-мастацкае выданне

Сацута Наталля

Вершы

Кобрынская цэнтральная раённая бібліятэка
г. Кобрын, вул. Жукава, 12